УДК 94 (476) «1921/1939»

*Г.С. Вайцешчык*

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАЕ РАЗВІЦЦЁ МЯСТЭЧКАЎ ВІЛЕНСКАГА ВАЯВОДСТВА Ў 1921–1939 гг.

У артыкуле даецца аналіз сацыяльна-эканамічнага развіцця мястэчкаў Віленскага ваяводства ў 1921–1939 гг. Уключэнне Заходняй Беларусі ў склад Польшчы ў 1921 г. прадвызначыла новы этап гістарычнага развіцця для заходнебеларускіх мястэчак, колькасць якіх у значнай ступені перавышала колькасць гарадоў, і з-за нешматлікасці апошніх іх сацыяльна-эканамічныя функцыі бралі на сябе мястэчкі. Спецыфіка развіцця Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы прадвызначыла пэўныя рэгіянальныя асаблівасці і кірункі сацыяльна-эканамічнага развіцця мястэчкаў Віленскага ваяводства. На аснове аналізу архіўных крыніц і літаратуры аўтарам даследуецца роля, якую выконвалі мястэчкі ў эканамічным развіцці Віленскага ваяводства, даецца аналіз месца мястэчкаў у сістэме населеных пунктаў Віленшчыны, вызначаюцца асноўныя кірункі і формы развіцця местачковай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і гандлю.

## Уводзіны

Даследаванне сацыяльна-эканамічнага развіцця мястэчак Віленскага ваяводства, якія значна пераўзыходзілі па сваёй колькасці гарады, з’яўляецца вельмі важным для аб’ектыўнай рэканструкцыі гістарычных фактаў і падзей такога складанага перыяду ў беларускай гісторыі, як 20–30 гг. XX ст., тым больш што большасць сучасных і савецкіх даследчыкаў у сваіх працах падкрэсліваюць выключна застойны і дэпрэсіўны характар эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Менавіта таму мэта дадзенага артыкула – паказаць на прыкладзе мястэчкаў Віленскага ваяводства, што сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі не спынялася і мела шмат прагрэсіўных з’яў і працэсаў нават ва ўмовах абмежаванай і стрыманай палітыкі польскіх улад. Для дасягнення пастаўленай мэты былі вызначаны наступныя задачы: выявіць галоўныя асаблівасці і тэндэнцыі ў развіцці местачковай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і гандлю, вызначыць ролю мястэчак у сацыяльным развіцці Віленскага ваяводства ў 1921–1939 гг.

## Месца мястэчкаў у структуры паселішчаў

З 1921 г. мястэчкі Заходняй Беларусі былі ўключаны ў новую тэрытарыяльна-адміністрацыйную сістэму Польшчы, якая пераўтварыла гэтыя населеныя пункты ў цэнтры гмін і паветаў. Паводле статыстычных дадзеных «Спіса мясцовасцей» за 1927 г. у Віленскім ваяводстве налічвалася 15 гарадоў і 77 мястэчак, якія ўваходзілі ў склад 8 паветаў: Браслаўскага, Дзісенскага, Маладзечанскага, Ашмянскага, Пастаўскага, Вілейскага, Свянцянскага, Віленска-Трокскага [1, с. 1919].

Адной з адметных рысаў мястэчкаў, што адрознівала іх ад сельскіх паселішчаў і набліжала да гарадоў, была сацыяльная і этнаканфесійная стракатасць насельніцтва. У мястэчках пражывалі і гарадскія (мяшчане, купцы, рамеснікі, ганаровыя грамадзяне, чыноўнікі), і сельскія саслоўі. На працягу 1921–1939 гг. адбываліся змены і ў этнаканфесійным складзе насельніцтва мястэчак: павялічвалася колькасць палякаў за кошт ваенных асаднікаў, якія масава атрымлівалі землі ў мястэчках. У 1931 г. у Віленскім ваяводстве зямлю атрымала найбольшая колькасць асаднікаў – 2830 чалавек [2, с. 162]. Была значнай колькасць і ўдзельная вага яўрэяў, якія пераважалі над прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей. Гэта было выклікана лаяльнымі адносінамі польскага ўрада да яўрэйскай нацыянальнай меншасці. Яўрэйскія абшчыны ў мястэчках Віленскага ваяводства пераўтварыліся ў самастойныя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі.

Навуковы кіраўнік – І.П. Крэнь, кандыдат гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы

Уявіць карціну нацыянальнай і канфесійнай структуры насельніцтва мястэчак Віленскага ваяводства можна з дапамогай апублікаваных матэрыялаў перапісаў насельніцтва 1921 г. і 1931 г. па Віленскім ваяводстве. Да дадзеных польскіх перапісаў насельніцтва трэба адносіцца вельмі крытычна па прычыне свядомага завышэння колькасці палякаў і змяншэння літоўскага і беларускага насельніцтва, аднак гэтыя крыніцы з'яўляюцца найбольш поўнымі і амаль што адзінымі, па якіх можна характарызаваць сацыяльную структуру насельніцтва мястэчак Віленскага ваяводства.

Згодна з перапісам 1921 г., найбольшую колькасць насельніцтва ў мястэчках Віленскага ваяводства складалі палякі (да 50%), на другім месцы – яўрэі (да 40%), беларусаў назіралася да 20%, літоўцаў – да 10%, іншых нацыянальнасцей (немцы, рускія, татары і інш.) – да 5% [3]. Па праву яўрэйскімі можна назваць такія мястэчкі, як Браслаў, Опса, Друя, Даўгінава, Гарадок, Кужанец, Гальшаны, у якіх яўрэі складалі 40–50% насельніцтва [3]. У Браславе ў 1921 г. пражывалі 902 габрэі, што складала 57% ад усяго насельніцтва, у Даўгінаве – 1 395 габрэяў, што складала 39% ад агульнай колькасці насельніцтва, у Опсе – 334 габрэі (47%) [3, с. 3, 9, 79]. Колькасць літоўскага местачковага насельніцтва ў Віленскім ваяводстве складала толькі 12 296 чалавек, большасць якіх пражывала ў Свянцянскім павеце і Аранскай і Алькенінскай гмінах Віленска-Трокскага павета [4, с. 25]. Найбольшая колькасць беларусаў па перапісе 1931 г., пражывала ў мястэчках Дзісенскага, Маладзечанскага, Пастаўскага і Віленскага паветаў [5, с. 132].

Канфесійны склад насельніцтва мястэчак амаль поўнасцю адпавядаў нацыянальнаму. Найбольшую колькасць складалі рыма-католікі і іўдзеі. Мястэчкі Дунілавічы, Мядзёл, Ваўкалата, Іказнь, Касцяневічы выдзяляліся значнай колькасцю рыма-каталіцкага насельніцтва (ад 40 да 80% ад агульнай колькасці насельніцтва) [3, с. 22, 29, 38, 71, 85]. Праваслаўнае насельніцтва складала адносную большасць у такіх мястэчках: Маладзечна (65%), Лебедзева (35%), Краснае (53%), Ілля (44%), Парабродзе (71%), Пліса (59%), Козяны (75%) і інш. [3, с. 40, 67, 72, 83, 85, 89, 90].

У пачатку 30-х гг. XX ст. у Польшчы дзейнічала 19 мусульманскіх абшчын, пераважная большасць якіх знаходзілася на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Мястэчкі Відзы і Мядзёл былі буйнымі цэнтрамі мусульманства на Віленшчыне [6, с. 447].

З 48 стараверскіх абшчын, зафіксаваных у 1930 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі, 42 знаходзіліся ў Віленскім ваяводстве, у тым ліку ў мястэчках Відзы, Германавічы, Друя, Дзісна, Дукшты, Лучаі, Свір [7].

**Роля сельскай гаспадаркі**

Асноўнай, але не адзінай сферай эканамічнай дзейнасці жыхароў мястэчак Віленскага ваяводства была сельская гаспадарка, вядучай галіной якой было земляробства. Большасць местачковых сялянскіх гаспадарак мелі ў сярэднім ад 1 да 7 га зямлі, што было вельмі нязначным паказчыкам у параўнанні з існуючым зямельным фондам, большасць зямлі якога належала памешчыкам і буйным магнатам [8]. Мястэчка Варапаева Пастаўскага павета належала графу Канстанціну Пжэдзецкаму, які валодаў 4 132 га зямлі і быў уладальнікам амаль усіх прамысловых прадпрыемстваў у мястэчку. Ён уваходзіў у кола найбольш заможных асоб не толькі Заходняй Беларусі, але і Польшчы [9, с. 65]. Уладальніцай большасці зямельных надзелаў Вязынскай гміны, у тым ліку і маёнтка ў мястэчку Вязынь, была Зоф'я Гарадзінская, якой належала 12 432 га зямлі [10, л. 9зв.].

Гаспадаркі местачкоўцаў спецыялізаваліся пераважна на вырошчванні лёну і збожжавых культур. Па колькасці зямельнай плошчы, занятай пад пасевы лёну, Віленскае ваяводства займала першае месца сярод іншых ваяводстваў Заходняй Беларусі. У 1928 г. агульная плошча пасеваў ільну займала 37,1 тыс. га, у 1929 г. – 38,8 тыс. га, у 1930 г. – 35,8 тыс. га [11, с. 5]. Конегадоўля была найбольш распаўсюджаным заняткам у мястэчках-фальварках. Найбольш вядомыя пароды коней, якія славіліся на местачко-

вых рынках і за межамі ваяводства, вырошчвалі ў Паставах і Браславе [12, с. 8–9]. Газета «Dziennik Wileński» адзначала, што ў 1929 г. у Свіры і Красным адбыліся арганізаваныя Міністэрствам сельскай гаспадаркі 2 буйныя дэманстрацыйныя выставы парод хатняй жывёлы, на якіх узнагароджвалі грашовымі прэміямі найбольш адмысловых каняводаў [13; 14]. Практыка правядзення такіх выстаў была ў Віленскім ваяводстве паўсюднай.

Высокі працэнт земляробчага насельніцтва ў мястэчках Віленскага ваяводства выклікаў значнае павелічэнне колькасці земляробчых кааператываў у 1921–1927 гг., якія належалі Саюзу кааператываў у Варшаве, Саюзу гаспадарчых кааператываў Польскай рэспублікі ў Варшаве, Саюзу спажыўцоў Польскай рэспублікі ў Варшаве, Саюзу земляробчых кааператываў у Вільне. Найбольш буйнымі па колькасці членаў местачковымі кааператывамі былі «Rolnik» (Друя, Дунілавічы, Міёры, Браслаў), «Zjednoczenie» (Гальшаны, Кабыльнік, Падброддзе), «Zgoda» (Будслаў, Касцяневічы). «Nadzieja» (Празарокі, Ігналіна, Кужанец), кааператыў спажыўцоў «Зерне», «Плуг», «Адзінства» (Баруны, Дукшты, Яшуны, Козяны і інш.) [1]. Кааператыў «Згода» ў Будславе, які дзейнічаў з 1921 г., налічваў у 1933 г. 510 членаў [15, л. 2].

У цэлым прадукцыйныя сілы сялянскай гаспадаркі зрабілі пэўны крок наперад. Развіццё капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы мястэчкаў праяўлялася ў павелічэнні колькасці спецыялізаваных гаспадарак: збожжавых, ільнаводчых, жывёлагадоўчых, рыбных, – якія паступова набывалі таварны характар, а таксама частковай механізацыі сельскай гаспадаркі і выкарыстанні наёмнай рабочай сілы.

**Рамяство і прамысловасць**

Неабходна адзначыць, што ў 20–30 гг. XX ст. местачковае рамяство было цесна звязана з рамяством сельскім, так званымі народнымі промысламі. Мястэчкі Свянцяны, Радашковічы былі буйнымі цэнтрамі ганчарства, Варняны, Лебедзева, Гальшаны – ткацкага промыслу [16, с. 302]. У адрозненне ад вясковых народных умельцаў местачковыя рамеснікі паступова станавіліся манапалістамі ў сферы рамесніцкай вытворчасці гмін, а мястэчкі – цэнтрамі рамёстваў па колькасці вырабляемай прадукцыі і рынках яе збыту.

Колькасць рамесніцкіх спецыяльнасцей у мястэчках Віленскага ваяводства была невялікай (ад 10 да 25), што тлумачылася нізкім тэхнічным узроўнем рамяства, адсутнасцю прафесійных рамесных школ, а таксама досыць складаным працэсам атрымання рамесных карт для легалізацыі занятку. Напрыклад, у Кабыльніках у 1931 г. было толькі 9 рамеснікаў: 4 шаўцы, 2 кавалі, 2 краўцы, 1 бляхар [17, л. 33–34зв.]. У мястэчку Ілля ў 1927 г. налічвалася 60 рамеснікаў 13 рамесных спецыяльнасцей: 25 шаўцоў, 8 кавалёў, 6 краўцоў, 4 рэзнікі, 4 сталяры, 4 цесляры, 2 чапнікі, 2 муляры, 1 бондар, 1 бляхар, 1 цырульнік, 1 рымар, 1 гадзіннікавы майстар [1, с. 1926]. Найбольш запатрабаванымі рамеснымі спецыяльнасцямі ў мястэчках Віленскага ваяводства былі спецыяльнасці, звязаныя з апрацоўкай скуры, металу, вырабам адзення, абутку і спажывецкім промыслам.

Местачковае рамяство было цесна звязана з прамысловасцю. Найбольшае развіццё ў мястэчках Віленскага ваяводства атрымала харчовая, мінеральная і гарбарныя галіны прамысловасці, у меншай ступені – лясная. Увогуле харчовая прамысловасць, як адзначае В. Фрышман, па колькасці прадпрыемстваў займала першае месца ў Заходняй Беларусі. У 1930 г. колькасць прадпрыемстваў харчовай прамысловасці складала 3 590, у 1931 г. – 3 557, у 1932 г. – 3 403 [18, с. 83]. На долю Віленскага ваяводства ў 1930-я гг. прыпадала 1 206 прадпрыемстваў харчовай прамысловасці, на якіх працавалі 3 692 рабочыя [19, л. 2].

Вытворчасць спіртных напояў адносілася да найбольш прыбытковых галін прамысловасці. Местачковыя бровары, спіртзаводы і вінна-гарэлачныя заводы былі дробнымі і належалі памешчыкам ці яўрэям. Абслугоўвалі такія прадпрыемствы толькі свой унутраны рынак. Згодна з дадзенымі «Спіса мясцовасцей» за 1927 г., у мястэчках Вілен-

скага ваяводства налічвалася 78 вінакурных заводаў, бровараў і спіртзаводаў [1]. Сапраўднымі цэнтрамі па вытворчасці спіртных напояў выступалі такія мястэчкі, як Браслаў, Даўгелішкі, Дунілавічы, Друя, Слабодка, Параф'янава, Паставы, Новы Пагост, Лынтупы, Маладзечна, Нямечын, Новы Мядзёл, у якіх дзейнічалі па 2–5 прадпрыемстваў гэтай галіны прамысловасці [1, с. 1919, 1921–1923, 1933, 1935, 1943, 1938–1940 ]. У мястэчку Мейшагола ў 1927 г. дзейнічала 5 бровараў і 1 вінакурны завод [1, с. 1933].

Мястэчкі Віленскага ваяводства былі цэнтрамі па вытворчасці кандытарскіх і хлебных вырабаў. Местачковыя пякарні з'яўляліся дробнымі немеханізаванымі рамеснымі прадпрыемствамі (у большасці сваёй 8-й прамысловай катэгорыі), на якіх працавала ад 1 да 3 рабочых. Уладальнікамі пякарняў былі пераважна яўрэі. У Браслаўлі ў 1927 г. працавалі 7 дробных яўрэйскіх пякарняў [1, с. 1919].

Малочная галіна прамысловасці ў мястэчках Віленскага ваяводства мела ў большасці кааператыўную форму дзейнасці. У мястэчках Хаценчыцы, Крывічы, Солы дзейнічалі невялікія малочныя кааператыўныя заводы [1, с. 1944; 20, л. 5; 21, л. 6]. Усяго ў 1937 г. налічвалася ў Віленскім ваяводстве 154 малочныя прадпрыемствы [22, л. 118].

Асобае месца ў прамысловым развіцці Віленскага ваяводства займала мінеральная прамысловасць, а менавіта шкляная, цэментная, бетонная, цагляная вытворчасць. Доля мястэчак у развіцці гэтай галіны прамысловасці была дастаткова значнай. Местачковыя цагельні былі дробнымі прыватнымі прадпрыемствамі з колькасцю рабочых ад 5 да 15 чалавек. Па тры цагельні дзейнічалі ў Рымшанах, па дзве – у Відзах, Козянах, па адной – у большасці мястэчак ваяводства [1, с. 1943, 1948; 23, л. 293]. На цагельні В. Смольскага ў Крывічах працавала ў 1938 г. 8 рабочых, на бетанярні ў Браславе – 14 рабочых [21, л. 6; 24, л. 161]. Невялікае шкляное прадпрыемства В. Вайштэйна дзейнічала ў Браславе да 1937 г. [1, с. 1919]. На шклозаводзе «Гута» у Варапаева Пастаўскага павета працавалі спецыялісты з Бельгіі, якія выраблялі прыгожыя вазы з рознакаляровага шкла [10, с. 63].

Да тэкстыльнай прамысловасці належала вытворчасць і пераапрацоўка лёну. Усяго на тэрыторыі Віленскага ваяводства ў 1920-х гг. налічвалася 86 тэкстыльных прамысловых прадпрыемстваў [19, л. 2]. Местачковыя льнамяльні, трапальні і часальні Віленскага ваяводства ў большасці сваёй належалі сельскагаспадарчым і гандлёвым кааператывам. Мястэчка Дунілавічы было сапраўдным цэнтрам тэкстыльнай прамысловасці ў Дунілавіцкім павеце: працавала прыватная фабрыка па вытворчасці дываноў, кааператыўны ткацкі цэх, фарбавальня [10, с. 36]. Часальня бавоўны ў мястэчку Гальшаны, якая належала Х. Берману, вырабляла ў 1923–1924 гг. 25 пудоў бавоўны [25, л. 206]. У мястэчку Варапаева дзейнічала адна з пяці буйнейшых механізаваных фабрык па вытворчасці льнянога семені ў Віленскім ваяводстве, прадукцыя якой ішла на экспарт у Германію, Аўстрыю, Чэхаславакію [26, с. 20].

Нельга не адзначыць ролю асобных мястэчак у развіцці гарбарнай прамысловасці. У 1931 г. у Віленскім ваяводстве працавала 148 гарбарняў з 2 612 рабочымі, большасць з якіх знаходзілася ў мястэчках [19, л. 2]. Мястэчкі Дунілавічы, Мядзёл, Паставы, Кабыльнік, Крэва, Кужанец, Новы Пагост, Слабодка, Мейшагола, Лынгмяны з'яўляліся буйнейшымі цэнтрамі гарбарства; тут дзейнічалі ад 2 да 5 прыватных гарбарняў, на якіх працавала да 10 рабочых [1, с. 1923, 1940; 27, л. 210, 231; 17, л. 17].

Дрэваапрацоўчая прамысловасць у мястэчках Віленскага ваяводства не атрымала такога развіцця, як у мястэчках Палескага і Беластоцкага. Найбольш значнымі цэнтрамі дрэваапрацоўчай прамысловасці Віленскага ваяводства былі мястэчкі Вішнева, Варапаева, Дунілавічы, Рудзішкі, Міёры, Мядзёл, Паставы, Лынтупы, Празарокі, Козяны, Яшуны. Згодна са справаздачай інспектара працы за 1926 г., на лесанарыхтоўцы ў мястэчку Вішнева працавала каля 1 000 сезонных рабочых [18, с. 14]. Да 1931 г. у мястэчку Міёры Дзісненскага павета працавала буйнейшая ў Заходняй Беларусі фабрыка запалкавай саломкі [28, с. 77].

Папяровая прамысловасць Віленскага ваяводства была прадстаўлена вытворчасцю паперы, розных сартоў кардону і драўлянай масы. Чатыры прыватныя кардонныя фабрыкі працавалі ў мястэчках Рачкі (уладальнік В. Швац), Новы Мядзел (В. Кав), Яшуны (А. Салтанава), Козяны [1, с. 1928; 23, л. 294; 24, л. 161]. У Алькеніках з 1922 г. працавала дзяржаўная фабрыка паперы [1, с. 1936].

**Гандлёвыя функцыі мястэчкаў**

Гандлёвая функцыя мястэчак з'яўлялася вядучай, менавіта яна фарміравала іх аблічча як спецыфічных паселішчаў, нятоесных вёсцы і блізкіх да гарадоў. Унутраны гандаль мястэчак Віленскага ваяводства ажыццяўляўся ў трох формах: перыядычнай (кірмашовай, базарнай), неперыядычнай (развозна-разноснай), стацыянарнай (крамнай, магазіннай, лавачнай). Дамінуючае значэнне меў стацыянарны гандаль, які паступова выцесніў перыядычныя і неперыядычныя формы гандлёвай дзейнасці. Аднак усе тры формы ўнутранага гандлю развіваліся паралельна, дапаўняючы адна адну і выконваючы пэўную функцыю: перыядычная і развозна-разносная абслугоўвала ў асноўным вёску, стацыянарная – мястэчка.

Каб акрэсліць значэнне кірмашовага гандлю, яго інтэнсіўнасць, шырыню ахопу насельніцтва, разгледзім працягласць местачковых кірмашоў. У 20–30 гг. ХХ ст. у ваяводстве местачковыя кірмашы доўжыліся толькі 1-2 дні, гарадскія – ад 2 да 5 дзён. Скарачэнне працягласці кірмашоў садзейнічала паскоранаму абароту капіталу, паколькі гандляр за той жа час паспяваў наведаць большую колькасць кірмашоў, чым раней. Местачковыя кірмашы абслугоўвалі толькі пэўны мясцовы рынак, у той час як гарадскія – агульнапольскі рынак. Гандлёвыя тавараздвароты местачковых кірмашоў былі невялікімі.

Па часе правядзення местачковыя кірмашы ўмоўна можна падзяліць на звычайныя і святочныя. Звычайны (паўсядзённы) кірмаш праводзіўся па пэўных датах штогод (калі на гэту дату прыпадала каталіцкае свята, то кірмаш пераносіўся на наступны дзень). Святочныя кірмашы былі прыўрочаны да пэўнага рэлігійнага свята (звычайна каталіцкага) і праходзілі ў дзень свята ці ў наступныя дні. Буйныя рэлігійныя святы (Раство, Пасха, дзень Св. Тройцы, Тры каралі, Вялікі пост, Зялёныя святы і інш.) выступалі пунктам адліку часу на правядзенне кірмашоў. Так, у мястэчку Кужанец Вілейскага павета звычайныя кірмашы праходзілі 6 жніўня, 8 верасня, 9 снежня, а святочныя – у першы аўторак пасля Раства, апошні аўторак перад Вялікім пастом, у другі аўторак пасля Вялікай ночы (Wiełkanoc) [29, л. 151]. Штогадовыя святочныя кірмашы ў Міёрах адбываліся ў чацвер, пятніцу, аўторак пасля свята «Тры каралі», 24 чэрвеня (на Св. Яна), 1 лістапада (у дзень Усіх Святых) [30, л. 63].

Немалаважную ролю ў структуры ўнутранага размеркавання прадуктаў адыгрываў базарны гандаль, які паступова выцясняў кірмашы. «Слова «базар» здаўна перайшло ў рускую мову ў сэнсе 'таржышча, рынак' [31, с. 685]. У такіх мястэчках, як Свянцяны і Дукшты, таргі збіраліся тры разы на тыдзень, у Лынтупах, Друі, Міёрах, Дзісне, Відзах, Новым Пагосце – па два, а ў астатніх мястэчках – адзін раз на тыдзень [30, л. 63–78]. Штотыднёвыя таргі ў мястэчках Віленскага ваяводства былі аднадзённымі. Гандлёвым днём мог быць любы дзень тыдня, за выключэннем суботы. Магчыма, гэта было звязаны з тым, што вялікі працэнт насельніцтва мястэчкаў складалі яўрэі, роля якіх у рамястве і гандлі была дамінуючай. У суботу яўрэі звычайна не займаліся ніякай дзейнасцю, у тым ліку гандлем.

З удасканаленнем сферы таварна-грашовага абарачэння, паступовым пашырэннем унутранага рынку побач з кірмашовым і базарным гандлем набіраў сілу стацыянарны гандаль – крамны, лавачны. Значэнне гэтай формы гандлёвых адносінаў паступова ўзрастала, і была яна дамінуючай для многіх мястэчак Віленскага ваяводства ў 1921–1939 гг.

Асаблівае развіццё ў мястэчках атрымаў крамны гандаль. Колькасць магазінаў, дробных і сярэдніх лавак у асобных мястэчках дасягала 100, а то і больш. Пераважалі прадуктовыя магазіны, бакалеі, магазіны галантарэйных і каланіяльных тавараў, карысталіся попытам лаўкі рамесных вырабаў, крамы адзення, абутку, кандытарскія і мясныя лаўкі. Уладальнікамі крам і дробных лавак былі пераважна яўрэі. Як сведчаць архіўныя крыніцы, у мястэчку Кужанец у 1938 г. дзейнічала 138 кропак сталага гандлю, большасць з якіх належала яўрэям [15, л. 18]. У мястэчку Свір у 1927 г. дзейнічала 50 магазінаў: 35 каланіяльных, 10 бакалейных, 2 галантарэі, 2 абутковыя [1, с. 1947]. У 1923 г. 38 крам было ў мястэчку Шаркоўшчына, 37 – у Новым Пагосце, 25 – у Козянах, 23 – у Міёрах, 20 – у Празароках, 16 – у Плісе [23, л. 246, 259, 270, 280зв, 283, 294, 297]. Канцэнтрацыя месцаў сталага гандлю была вельмі шчыльнай вакол рыначнай плошчы і цэнтральных вуліц мястэчка. Найбольш пакупнікоў у магазінах і лаўках збіралася ў канцы восені, калі быў скончаны збор ураджаю. Тавары ў крэдыт звычайна не выдаваліся (акрамя некаторых яўрэйскіх лавак і магазінаў).

Асаблівы даход уладальнікам і мястэчку прыносілі піцейныя ўстановы: рэстараны, кафэ, сталовыя, сталовыя-тракціры, корчмы, піваварні, бары, буфеты. Амаль у кожным мястэчку былі гасцініцы і заезныя дамы, колькасць якіх залежала ад гандлёва-прамысловай інфраструктуры мястэчка. Заезныя дамы былі самым танным месцам часовага прыпынку, і іх было значна больш у параўнанні з колькасцю гасцініц. У мястэчках Пастаўскага павета Дунілавічы і Паставы было па 4 заезныя дамы і па адной гасцініцы [32, л. 22].

Развозна-разносным гандлем у мястэчках займаліся пераважна яўрэі, якія ў архіўных дакументах сустракаліся пад назвай вулічныя гандляры. Яны на таргах і кірмашах скуплялі розную дробязь, а потым перапрадавалі свой тавар у вёсках, мястэчках, гарадах. Працэнт вулічных гандляроў у мястэчках быў невысокім, на вядзенне такога гандлю неабходна было атрымаць ліцэнзію. Крыніцы дазваляюць прасачыць, што ў 1927 г. у мястэчку Беніца было 5 вулічных гандляроў, Гарадок – 2, Лебедзева – 1, Баруны – 1, Маньковічы – 1, Падабрэззе – 1, Рудоміна – 1, Відзы – 1, Жабкі – 1 [1, с. 1919, 1925, 1931, 1933, 1939, 1942, 1948, 1980]. Вулічныя гандляры не стваралі амаль ніякай канкурэнцыі стацыянарнаму гандлю, бо цэны на тавары ў вулічных гандляроў былі вышэйшымі.

Узрастала колькасць фінансава-крэдытных устаноў у мястэчках. Згодна з дадзенымі «Спіса мясцовасцей» за 1927 г., у 42 мястэчках Віленскага ваяводства дзейнічалі 3 касы Стэфчыка, 22 яўрэйскія кааператыўныя банкі, 9 хрысціянскіх кааператыўных банкаў, 18 ашчадных кас [1].

**Сацыяльны дабрабыт насельніцтва мястэчак**

Ад развіцця гандлёва-прамысловай інфраструктуры ў значнай ступені залежаў сацыяльны дабрабыт насельніцтва мястэчак. Як цэнтры гмін, некаторыя мястэчкі выконвалі адміністрацыйныя функцыі. Будынкі пошты, тэлеграфа, чыгуначнага вакзала, гміннай управы, паліцэйскага пастарунка сталі атрыбутамі местачковага жыцця ў 20–30 гг. XX ст. У такіх мястэчках, як Браслаў, Даўгінава, Друя, Ілля, Краснае, Крывічы, Маладзечна, Паставы, Смолвы, Шаркоўшчына, Свір, Відзы, дзейнічалі адвакацкія і натарыяльныя канторы [1]. У 1937–1938 гг. Віленскі ваявода ў справаздачы адзначаў, што жылы і гандлёва-прамысловы сектар мястэчак Дунілавічы, Паставы, Маладзечна, Дукшты, Солы поўнасцю забяспечаны электрычным святлом [22, л. 79]. У 1937 г. на тэрыторыі Віленскага ваяводства было зарэгістравана 4 532 тэлефонныя апараты [22, л. 79].

Ахова здароўя насельніцтва мястэчак Віленскага ваяводства ў 1921–1939 гг. была арганізавана цэнтральнай і мясцовай адміністрацыяй па некалькіх накірунках, але колькасць медыцынскіх устаноў была нязначнай, каб вырашыць такія значныя праблемы, як барацьба з эпідэміямі і заразнымі хваробамі. Аналіз архіўных дадзеных дазваляе сцвярджаць, што ў 1925 г. на тэрыторыі ваяводства налічвалася 25 бальніц (на 1 815 лож-

каў), з якіх 8 – у мястэчках Крывічы, Гайдуцішкі, Шумск, Лужкі, Маладзечна, Краснае, Гарадок, Лебедзева [33; 34]. З 19 амбулаторый па Віленскім ваяводстве ў мястэчках дзейнічалі 8 (у Варнянах, Новым Пагосце, Празароках, Свіры, Свянцянах, Дунілавічах, Алькеніках) [1, с. 1980; 35, л. 16зв.; 36, л. 36; 37, с. 23]. У мястэчках Кабыльнікі, Даўгінава, Вайстомль, Жодзішкі, Крывічы працавалі гмінныя паліклінікі, якія ўтрымліваліся мясцовай адміністрацыяй [9, л. 7; 15, л. 6зв.; 21, л. 5зв.; 38, л. 7; 39, л. 14; 40, л. 4]. Менавіта ў такіх паліклініках ствараліся санітарныя камісіі, якія накіроўваліся на прамысловыя прадпрыемствы і гандлёвыя пункты для кантролю за іх санітарна-гігіенічным станам. Адміністрацыя паліклінік наладжвала і кантралявала працу гмінных урачоў і фельчараў. Фельчарскіх пунктаў у мястэчках было няшмат, аднак фельдчараў магло быць некалькі ў адным населеным пункце. Па стане на 1935 г. з 12 427 урачоў Польшчы ў Віленскім ваяводстве працавалі 630. З іх 480 працавалі ў Вільні і толькі 108 у павятовых гарадах і 42 у мястэчках [1; 41, с. 147]. Спецыялізаваная медыцынская дапамога аказвалася толькі ў вялікіх гарадах. У 77 мястэчках у 1927 г. працавалі 24 акушэркі і 12 урачоў-дантыстаў [1; 15, л. 2зв., 6зв., 17зв.]. Местачковае насельніцтва ў 1930-я гг. абслугоўвалі 43 аптэкі і 28 аптэчных складоў [1].

**Заключэнне**

Мястэчкі ў 1921–1939 гг. неабходна разглядаць як важнае структурнае звяно ў сістэме населеных пунктаў Віленскага ваяводства. У сувязі з невялікай колькасцю гарадоў Віленшчыны мястэчкі выконвалі сацыяльна-эканамічныя функцыі ў гміне і нават у паветах Віленскага ваяводства. Польская ўлада бачыла ў мястэчках своеасаблівую зону абмену (у першую чаргу эканамічную) паміж вёскай і горадам і не перашкаджала іх эканамічнаму развіццю, але і асабліва не падтрымлівала развіццё местачковай прамысловасці, рамяства і гандлю. Наяўнасць у многіх мястэчках развітой дробнатаварнай вытворчасці ў форме рамяства і дробнакапіталістычных прамысловых прадпрыемстваў, поўнага спектру вядомых на той час усіх форм арганізацыі гандлю з’яўлялася сведчаннем шырокага распаўсюджвання прадпрымальніцкай ініцыятывы местачкоўцаў, гібкасці і прыстасаванасці мясцовай эканомікі да ўсіх цяжкасцей эканамічнага развіцця Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы.

Галоўную ролю ў станаўленні мястэчка як гандлёва-прамысловага цэнтра гміны і павета адыгрывалі яўрэі, якія этнічна дамінавалі ў сацыяльным складзе насельніцтва мястэчак. Гандаль быў сканцэнтраваны пераважна і нават амаль выключна ў іх руках, аб чым сведчыла прыналежнасць ім амаль усіх местачковых гандлёвых устаноў. Гандлёвая інфраструктура мястэчкаў Віленскага ваяводства, прадстаўленая значнай колькасцю магазінаў і крам, а таксама гасцініц, заезных дамоў і разнастайных піцейных устаноў, дае магчымасць сцвярджаць, што гэты населены пункт паступова набліжаўся да гарадоў, страчваючы пры гэтым сваю местачковую асаблівасць як паселішча пераходнага стану паміж вёскай і горадам.

Сацыяльны дабрабыт местачковых жыхароў быў значна лепшым ад вясковага насельніцтва. Мястэчкі выступалі асяродкамі медыцыны і эпідэміялогіі для цэлай гміны, што было надзвычай важным для насельніцтва вёсак, аддаленага ад гарадскіх цэнтраў аховы здароўя.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Spis mejscowości. Do części adresowej. – Warszawa : KSRP, 1927. – 2479 s.

2. Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Беларуси (1920–1939 гг.) / А.А. Сорокин. – Минск : Наука и техника, 1968. – 204 с.

3. Skorowidz miejscowości Rzeczypospolitej Polskiej. T. 8., cz. 2: Ziemia Wileńska. Powiaty Brasław, Duniłowicze, Dzisna i Wilejka. – Warszawa : KSRP, 1923. – 117 s.

4. Матулайтис, Е.К. Литовцы под гнетом Польши / Е.К. Матулайтис. – Минск : Изд-во АН БССР, 1936. – 79 с.

5. Srebrakowski, A. Struktura narodowościowa Kresów Północno-Wshodnich II Rzeczypospolitej w latach 1931–1939 / A. Srebrakowski // Rola oświaty i szkolnictwa w proceśie kształtowańia się świadomości narodowej na pograniczu polsko-litewsko-białoruskim. – Białystok : Prymat, 2007. – S. 127–148.

6. Вабішэвіч, А. Заходняя Беларусь пад уладай Польшчы / А. Вабішэвіч, У. Палуян // Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск : Экаперспектыва, 2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. – С. 352–458.

7. Спіс стараверскіх абшчын Польшчы ў 1930 г. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://samstar-arhiv.ucoz.ru/publ/49-1-0-64. – Дата доступу : 26.02.2011.

8. Списки имений по поветам Виленского воеводства с указанием их владельцев (1923–1933 гг.) // Занальны дзяржаўны архіў у Маладзечне (ЗДАуМ). – Фонд 439. – Воп. 1. – Спр. 1927, 1929, 1930, 1931.

9. Зямчонак, І.П. Мястэчка пры гасцінцы / І.П. Землячок. – Мінск : Беларусь-Інфарм-Сервіс, 1995. – 129 с.

10. Политико-экономическое описание района постерунка Вязын // ЗДАуМ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 372.

11. Jasmin, J. Skrót wiadomości o lnie i konopliah / J. Jasmin. – Wilno : PAX, 1933. – 133 s.

12. Korybutiak, Z.J. Hodowlia zwierząt domowych i pasterstwo w Wileńskim i Nowogródzkiem wojwództwach / Z.J. Korybutiak. – Wilno: Nakladem Dziennika Urzędowego Kuratorjum Okr. Szk. Wileńskiego, 1936. – 32 s.

13. Dziennik Wileński. – 1929.– 19 lip. – S. 4.

14. Dziennik Wileński. – 1929. – 10 sierp. – S. 4.

15. Политико-экономическое описание района постерунка Будславль (1933 г.) // ЗДАуМ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 235.

16. Вайцешчык, Г.С. Традыцыйныя промыслы мястэчак Заходняй Беларусі ў 20–30 гг. XX ст. / Г.С. Вайцешчык // Содружество наук. Барановичи–2009 : материалы V Междунар. науч.-практ. конф. молодых исслед., 21–22 мая 2009 г. – Барановичи : РИО БарГУ, 2009 – С. 302–303.

17. Списки ремесленников и переписка с поветовыми старостами об организации курсов рабочих, о выдаче разрешения на открытие мастерских (1931 г.) // ЗДАуМ. – Фонд 57. – Воп. 1. – Спр. 6.

18. Фришман, В. Промышленность Западной Беларуси / В. Фришман. – Минск : Изд-во Бел. акад. наук, 1939. – 129 с.

19. Состояние промышленности в Виленском воеводстве (1929–1933 гг.) // Цэнтральны дзяржаўны архіў Літвы (ЦДАЛ). – Фонд 51. – Воп. 6. – Спр. 73.

20. Политико-экономическое описание района постерунка Хотенчицы // ЗДАуМ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 565.

21. Политико-экономическое описание района постерунка в Кривичах // ЗДАуМ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 474.

22. Отчет Виленского воеводы об общем состоянии воеводства (1937–1938 гг.) // ЦДАЛ. – Фонд 51. – Воп. 2а. – Спр. 620.

23. Списки владельцев промышленных и торговых предприятий (1923 г.) // ЗДАуМ. – Фонд 437. – Воп. 1. – Спр. 1402.

24. Статистика предприятий промышленных, занятых в них рабочих и количество выпускаемой продукции за 1932 г. // ЦДАЛ. – Фонд 51. – Воп. 6. – Спр. 380.

25. Заявление граждан на право открытия торговых и промышленных предприятий (мастерские, парикмахерские и т.д.) (1923–1924 гг.) // ЗДАуМ. – Фонд 4. – Воп. 1. – Спр. 448.

26. Nagurski, T. Przemysł i handel w województwach Wileńskiem i Nowogródzkiem / T. Nagurski. – Wilno : PAX, 1934. – 60 s.

27. Статистические сведения гминных управлений о количестве мельниц и промышленных предприятий (1921–1922 гг.) // ЗДАуМ. – Фонд 2. – Воп. 1. – Спр. 11.

28. Князева, В. Падарожжа па Беларусі: гарады і гарадскія пасёлкі / В. Князева. – Мінск : Беларусь, 2005. – 303 с.

29. Торги и ярморки в Виленском воеводстве (1926 г.) // ЦДАЛ. – Фонд 51. – Воп. 5. – Спр. 63.

30. Торги и ярмарки в Виленском воеводстве (1929 г.) // ЦДАЛ. – Фонд 51. – Воп. 6. – Спр. 238.

31. Базар // Энциклопедический словарь. Т. I$^{Ia}$. Ауто – Банки / изд. Брокгауз – Ефрон. – СПб.: Тип. акц. об-ва Брокгауз – Ефрон, 1891. – С. 685.

32. Списки гостиниц и постоялых домов по Виленскому воеводству // ЦДАЛ. – Фонд 51. – Воп. 15. – Спр. 605.

33. Месячные отчеты о деятельности больниц по поветам Виленского воеводства (1923–1925 гг.) // ЦДАЛ. – Фонд 51. – Воп. 15. – Спр. 1517, 1519, 1536–1539, 1544, 1547.

34. Политико-экономическое описание постерунков Виленского воеводства (1933–1937 гг.) // ЗДАуМ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 7. – Л. 330; Спр. 52. – Л. 1–2; Спр. 152. – Л. 19; Спр. 235. – Л. 42; Спр. 238. – Л. 46–48.

35. Циркуляр Министерства общественного обеспечения о мерах борьбы с венерическими заболеваниями и копии удостоверения врачей (1926–1934 гг.). // ЗДАуМ. – Фонд 436. – Воп. 4. – Спр. 1.

36. Географическое описание полицейского постерунка Прозороки // ЗДАуМ. – Фонд 509. – Воп. 1. – Спр. 637.

37. Dobaczewska, W. Wileńszczyzna i Nowogródczyzna w latach 1920–1937. Sprawy polityczne i społeczne / W. Dobaczewska. – Wilno : Nakladem dziennika urzędowego kuratorium okr. szk, 1938. – 40 s.

38. Политико-экономическое описание района постерунка Войстомль (1935 г.) // ЗДАуМ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 334.

39. Политико-экономическое описание района постерунка в Долгинове (1937 г.) // ЗДАуМ. Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 378.

40. Политико-экономическое описание района постерунка в Жодишках // ЗДАуМ. – Фонд 10. – Воп. 1. – Спр. 393.

41. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Маладзечна і Маладзечанскага раёна / рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2002. – 792 с.

***Vaitseshchyk H.S.*** **Socio-Economic Development of Townships of Vilnius Province in 1921–1939 years**

In a scientific article considers the socio-economic development of small towns in Vilnius province in 1921–1939 years. The townships of western Belarus in 20–30 years of XX century that are quantitatively superior to the city were economic and administrative center not only of communes, but povets, province. Specificity of the Western Belarus under Polish rule predetermined regional features and trends of socio-economic development of townships of Vilnius province in the years 1921–1939. This article was written by native and foreign literature and archival sources, many of whom first appeared in the scientific. The results can be used as teaching materials disciplines of specialization in higher education of Belarus and to explore the economic history of Belarus.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 25.02.2012